# XII Майскія Віткаўскія чытанні «Па закліку сапраўднай любові»




Урачыстае адкрыццё Чытанняў «Па закліку сапраўднай любові» адбылося 16 мая 2019 года. У госці да чытачоў бібліятэкі завіталі галоўны рэдактар часопіса «Вясёлка» Уладзімір Ліпскі і супрацоўнікі рэдакцыі Анастасія Радзікевіч, Радміла Казлякевіч і Вікторыя Ляйкоўская, якая друкуе свае творы пад псеўданімам Віка Трэнас. Намеснік старшыні Слуцкага райвыканкама Наталля Чарнушэвіч зачытала прывітальны адрас старшыні Слуцкага райвыканкама ўдзельнікам Віткаўскіх чытанняў. Да школьнікаў з прывітальным словам звярнуўся Уладзімір Ліпскі. Чытачы бібліятэкі ў сваю чаргу пачыталі гасцям вершы беларускіх паэтаў. Танцавальны падарунак усім прысутным падрыхтавалі вучні гімназіі №2, удзельнікі раённага конкурсу «Вясновы вальс».




У час сустрэчы з юнымі чытачамі ў дзіцячай бібліятэцы госці распавялі пра гісторыю часопіса "Вясёлка", раказалі, якія творы друкуюцца на яго старонках, як стаць падпісчыкам перыядычнага выдання.

Аўтар кнігі “Мая Беларусь” Уладзімір Ліпскі запрасіў юных чытачоў у займальнае падарожжа па прасторах роднай краіны. «Мая Беларусь – гэта божы куток!», – так шчыра і кранальна казаў Уладзімір Сцяпанавіч пра Радзіму. У паэтычны марафон уключыліся гледачы, якія дэкламавалі вершы пра Беларусь.






Група ўдзельнікаў Чытанняў наведала школу №11, дзе літаратары правялі з глядзельнай залай гульнёвую праграму «Мая Беларусь». Самыя эрудзіраваныя і актыўныя ўдзельнікі атрымалі прызы. У дзяцей была ўнікальная магчымасць набыць або выйграць часопіс "Вясёлка", сфатаграфавацца з беларускімі пісьменнікамі і журналістамі.

Ужо каторы год запар дзень нараджэння слыннага земляка адзначаецца разам з мінскай дзіцячай бібліятэкай імя Васіля Віткі. 17 мая прайшоў тэлемост, які злучыў чытачоў двух гарадоў. Удзельнікі тэлемосту дэкламавалі вершы класіка беларускай дзіцячай літаратуры, задавалі пытанні сваім аднагодкам. Мінчане зрабілі для случчан віртуальную экскурсію па філіялу часопіса "Вясёлка", паказалі ўрывак з лялечнай пастаноўкі казкі "Вавёрчына гора". Прыемным момантам сталі зносіны з дзіцячым пісьменнікам, галоўным рэдактарам часопіса "Вясёлка" Уладзімірам Сцяпанавічам Ліпскім.




Адной з галоўных падзей другога дня Майскіх чытанняў стаў раённы літаратурны фестываль па папулярызацыі беларускай мовы і літаратуры «Случчанскія вытокі» сярод выхаванцаў дзіцячых дашкольных установ горада і раёна.







Маленькія артысты парадавалі гледачоў сваім уменнем чытаць вершы, распавядаць казкі, спяваць песні на роднай беларускай мове. Малышы з задавальненнем пабывалі ў бібліятэцы, пазнаёміліся з выставамі кніг і малюнкаў.

18 мая адбылося свята вуліцы Васіля Віткі, арганізаванае Дзяржаўнай установай «Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка» і ДУА «Сярэдняя школа №11 г. Слуцка». Для гасцей і жыхароў мікрараёна былі адрыхтаваныя лялечна-гульнёвая праграма "Урокі Васі Вясёлкіна», кніжная выстава "Паэт. Казачнік. Настаўнік», літаратурная сустрэча з членам Саюза







пісьменнікаў Беларусі Ганнай Міклашэвіч. А яшчэ ў госці да жыхароў мікрараёна завіталі вядомы віткаўскі персанаж Вася Вясёлкін і Васілінка, якія загадвалі дзецям загадкі, вялі дыялог пра творчасць пісьменніка. Сакавітае трапнае віткаўскае слова гучала на працягу ўсяго свята. Школьнікі чыталі вершы нашага славутага земляка, прадэманстравалі свае веды літаратурных персанажаў у конкурсе малюнкаў на асфальце. Свята ўпрыгожылі шоу мыльных бурбалак, паказальныя выступленні байцоў клуба «Фенікс», спартыўныя забавы. Свята сабрала шмат гледачоў розных узростаў, уражанні пакінула самыя яркія.

24 мая прайшла прэзентацыя кнігі Вісарыёна Крысько і Расціслава Бензерука «Жыў на свеце дзед Васіль». Для Расціслава Бензерука, пісьменніка, журналіста, члена Саюза пісьменнікаў Беларусі, Васіль Вітка быў незабыўным настаўнікам, які падтрымліваў яго на літаратурнай ніве. У сваёй кнізе Расціслаў Мацвеевіч успамінае пра сустрэчы з галоўным рэдактарам часопіса "Вясёлка". На мерапрыемстве выхаванка яслі-сада аграгарадка




Акцябр Ліза Васільева прадставіла сваю даследчую працу «Васіль Вітка - наш зямляк". Траюрадная пляменніца Васіля Віткі Ірына Стройкова распавяла пра свае дзіцячыя успаміны пра славутага дзеда, паказала фатаграфіі з сямейнага альбома. Удзельнікі лялечнага гуртка «Батлейка»

Замосцкай сярэдняй школы пад кіраўніцтвам бібліятэкара Фрейток Любові паказалі лялечны спектакль па казцы Расціслава Бензерука «Шпак і верабей».



Творчая сустрэча «Свята для сэрца» з членам Саюза пісьменнікаў Беларусі Анатолем Бензеруком працягнула літаратурны форум. Навучэнцы СШ№12 сардэчна павіталі беларускага пісьменніка, журналіста, гісторыка, краязнаўца на Случчыне паэтычнымі радкамі пісьменнікаў-землякоў. У ходзе сустрэчы, якая праходзіла ў форме дыялогу, усе прысутныя пазнаёміліся з творчасцю знакамітага госця, задавалі пытанні, бралі аўтографы, фатаграфаваліся з аўтарам гістарычных кніг. У сваю чаргу пісьменнік падрабязна расказаў пра свае далейшыя творчыя планы. На памяць Анатолю Бензеруку ўручылі слуцкі сувенір.



XII Майскія Віткаўскія чытанні завяршыліся анлайн-сустрэчай з дзіцячай бібліятэкай-філіялам №6 г. Мінска, якая носіць імя нашага земляка. У тэлемосце прынялі ўдзел беларускія пісьменнікі Расціслаў Бензерук і Анатоль Бензерук. Дзякуючы сучасным тэхнічным сродкам чытачы двух гарадоў атрымалі магчымасць задаць пытанні творчаму дуэту бацькі і сына, паслухаць іх кранальныя ўспаміны пра Васіля Вітку і яго сына Цімоха Крысько, у суаўтарстве з якім Расціслаў Бензерук напісаў кнігу «Жыў на свеце дзед Васіль».